# «Адзіная нацыяналістка Грыгаровіч»




Ядвіга Грыгаровіч. Фота 2002 года.

**31 жніўня ў Бараўлянах на 65-м годзе жыцця памерла былая рэктарка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ядвіга Грыгаровіч.**

Яна была родам з Бабруйскага раёна, з вёскі Даманава. Скончыла мінскі педінстытут, пасля чаго чатыры гады выкладала ў школах. Праз нейкі час жанчына апынулася ў Інстытуце педагогікі Акадэміі навук.

З 1982 года Грыгаровіч працуе ў Інстытуце культуры. У 1992 годзе студэнтамі і выкладчыкамі Ядвіга Грыгаровіч была абраная рэктарам ВНУ. У апошнім туры яе супернікам быў прафесар Анатоль Грыцкевіч.

Шмат гадоў разам з ёй ва ўніверсітэце адпрацаваў старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў. «Адна з нямногіх нашых патрыётак, хто не забываўся на беларускую мову, знаходзячыся ва ўладзе. Дзякуючы ёй усе справы ва ўніверсітэце вяліся па-беларуску», — кажа Алег Трусаў.

«Яна заўжды падкрэслівала сваю беларускасць, — працягвае Трусаў. — I словамі, і справамі. Часам збірала выкладчыкаў і прасіла, каб яны выкладалі па-беларуску. I цяпер Універсітэт культуры застаецца самым беларускім. Аднойчы яна паказвала раздрукоўку пасяджэння ў Лукашэнкі, дзе кіраўнік дзяржавы сказаў: «Адна Грыгаровіч нацыяналістка, па-беларуску гаворыць». Яна гэтым ганарылася. Лукашэнка таксама яе паважаў за тое, што яна заўсёды па-беларуску, а не перабягала на расійскую. Сваімі ўказамі ён пасля пакідаў яе на пасадзе».

Два гады таму прадстаўнікі інтэлігенцыі звярнуліся з адкрытым лістом да Лукашэнкі з просьбай пашырыць выкарыстанне беларускай мовы. Сярод падпісантаў была і Ядвіга Грыгаровіч. Ініцыятар збору подпісаў пісьменнік Васіль Якавенка згадвае: «Ахвотна падпісала. Запрасіла да сябе на працу. Я ёй яшчэ падарыў сваю кніжку «Пакутны век». Высока ставіла гэтую ініцыятыву».

Пра невылечную хваробу спадарыні Ядвігі было вядома ад 2007 года. Многія здзіўляліся, што яна працягвала хадзіць на працу. Цалкам адпрацавала мінулы навучальны год.

Другім мужам Грыгаровіч быў былы міністр унутраных справаў (1990—1994) і старшыня КДБ (ліпень 1994—снежань 1995) Уладзімір Ягораў. «Я ведаю гэтую гісторыю, — кажа Алег Трусаў. — Гэта было іх першае каханне, калі яны яшчэ вучыліся ў Магілёве. Потым шляхі разышліся. Аднак апошнія гады яны пражылі разам».

Ядвіга Грыгаровіч была дэпутатам савета рэспублікі. Некалі менавіта праз яе супраціў на паўгода замарудзілася прыняцце спрэчнага закона «Аб свабодзе веравызнання». У сенаце спадарыня Грыгаровіч таксама размаўляла па-беларуску.

**ЗП**

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ